

# “Слаўная вадзіца-царыца, з ста Іярдань”, або Святая, ці асвячоная, вада

**З прыходам хрысціянства на землях усходніх славян стаўленне да цудадзейнай вады набыло дадатковыя рысы. На працягу года царква некалькі разоў праводзіць абрад асвячэння вады, якая таксама стала лічыцца не проста цудадзейнай, а святой. Самым галоўным днём асвячэння вады стаў дзень Богаяўлення, або Вадохрышча. У народзе гэтую ваду лічаць найбольш “здаровай” і гаючай і называюць хрышчэнскай або іарданскай.**

## Святая Каляда ўхваляе нараджэнне Сонца і асвячае ваду

Святкаванне Каляд — першага свята гадавога колазвароту — было дакладна прымеркавана да руху Сонца. Некалі Каляды пачыналі святкаваць у ноч зімовага сонцастаяння, **з 24 на 25 снежня,** сёння праваслаўныя адзначаюць першы дзень Каляд **у ноч з 6 на 7 студзеня.** Гэты дзень атрымаў назву **Першая, Посная, Бедная, Вялікая, Галодная куцця.** Першая куцця па характары яе абрадавых дзеянняў і па паводзінах людзей быццам распачынала дыялог з продкамі і адначасова з Уладаром Нябёсаў.

Праходзіла яшчэ некалькі дзён, і ў ноч **з 31 снежня на 1 студзеня,** а пазней **з 13 на 14 студзеня** святкавалі сустрэчу новага года. У народзе гэты дзень атрымаў назву **Другая, Шчодрая, Багатая, Тоўстая куцця, Шчадрэц, Шчадруха, Васільеў дзень, Малання, Засеўкі, Новы (Стары) год.** Другая куцця павінна была паўплываць на будучы дабрабыт сям’і ўвогуле і на шчасце, поспех кожнага з дамачадцаў.

Трэці дзень падводзіў рысу ў шматдзённым святкаванні Каляд. У ноч **з 6 на 7 студзеня,** а пачынаючы з 1918 года ў ноч **з 18 на 19 студзеня** праваслаўныя беларусы адзначаюць **Трэцюю, Вадапосную, Галодную, Хрышчэнскую куццю, Вадапосце, Вадзянуху.** У цэнтры ўвагі гэтых святочных дзён была вада.



## Святое хрышчэнне Хрыста

Згодна з царкоўным праваслаўным календаром якраз у гэты дзень Ісус Хрыстос прыняў святое хрышчэнне. Гэты хрысціянскі абрад сімвалізуе ачышчэнне душы ад грахоў і поўную аддадзенасць Богу.

Свята мае і другую назву — Святое Богаяўленне. Калі Хрыстос выходзіў з вады, як сведчыць Святое Пісанне, адкрылася неба і на яго сышоў Святы Дух у выглядзе голуба, таму і Бога-яўленне.

У гэтае свята ў цэрквах адбываецца Вялікае асвячэнне вады ў памяць аб тым, што падчас хрышчэння Хрыста вада ў рацэ асвяцілася. Хрысціянскія вернікі прыносяць гэтую ваду дадому і захоўваюць на працягу года.

## “Ход на Іардан”

Удзень 18 студзеня на рацэ ці найбліжэйшым вадаёме некалькі мясцовых мужчын крыжападобна выразалі палонку, якую і называлі “Ярдань”. Усталяваны побач ледзяны крыж змазвалі бураковым сокам. На абодва канцы “перакладзіны” мацавалі запаленыя свечкі. Гэтае відовішча мела глыбокае эмацыянальна-псіхалагічнае і сакральна-магічнае ўздзеянне. Людзі былі перакананы, што і палонка, і месца вакол яе валодалі цудадзейнай сілай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пасля набажэнства ў храме вернікі на чале са святаром ладзілі своеасаблівы хрэсны ход — “ход на Ярдань”.

Пасля малебну каля палонкі і трохразовага апускання крыжа ў ваду, людзі, як і ў храме, набіралі яе ў слоікі і імкнуліся пакупацца ў толькі што асвячонай купелі. Цяжка хворыя спадзяваліся на палёгку, здаровыя і дужыя купаліся, каб і надалей захаваць “папараць-кветку” свайго шчасця.

Лічыцца, што ў свята Богаяўлення вада асвячаецца не толькі ў храмах, але і ва ўсіх рэках, азёрах, калодзежах. Па народных уяўленнях, Ісус Хрыстос спускаецца на зямлю, каб акунуцца ў святую ваду.

Абавязковаму абраду ачышчэння святой вадой падлягалі тыя вясковыя хлопцы, якія на Каляды хадзілі ў масках, і дзяўчаты, якія варажылі ў навагоднюю ноч.

Пры гэтым з пакалення ў пакаленне перадавалася вера ў тое, што нават у моцныя маразы захварэць пасля купання нельга. Аўтары гэтага артыкула ўжо не адзін год пераконваюцца ў справядлівасці такога меркавання...

Трэцяя, “вадзяная”, куцця быццам распачынала новае жыццё чалавека на зямлі. Нездарма кажуць, што жыццё пачалося з вады: Бог стварыў першай яе, кожны з нас фарміруецца ў вадзе, якая ўтрымліваецца ва ўлонні маці. Так і хрышчэнская вада павінна была змыць старую інфармацыю (хваробы, непрыемнасці, грахі) і нанесці новую, што прынясе здароўе, дабрабыт і поспех.

**Вялікім грахом лічылася ў гэты дзень выкарыстоўваць ваду для побытавых патрэб — мыцца, мыць бялізну, прыбіраць у хаце.**





## Святая вада — абярэг і лекавы сродак

Наўрад ці ў найбліжэйшы час нашы навукоўцы-прыродазнаўцы змогуць знайсці ключ да тайнаў калядных вечароў. Але гэтыя тайны ёсць, і імі шырока карысталіся нашы продкі, іх незвычайны патэнцыял выкарыстоўваем і мы.

Адна з таямніц сведчыць, што ў калядную ноч (з 2 да 5 гадзін раніцы) з 6 на 7 студзеня “расчыняюцца” нябёсы і кожны чалавек можа папрасіць дапамогі сабе і сваім блізкім. Другая тайна — гэта той прыродна-касмічны феномен, што здараецца адзін раз на год: 18-19 студзеня ўся вада, якая нас акружае і жывіць, раптам становіцца “пасярэбранай” настолькі, што можа захоўваць свае якасці на працягу ўсяго года. А некаторыя людзі сцвярджаюць, што “ярданскую” ваду можна ўжываць нават на працягу трох гадоў.

Асвячонай вадой можна было “адпаіць” смяротна хворых людзей, лячыць шматлікія хваробы, асабліва энергетычнага плана (сурокі, пярэпалах); ёю асвячалі хату і ўсе гаспадарчыя пабудовы, выкарыстоўвалі падчас закладвання падмурка новага дома; дзяўчаты варажылі на ёй, каб даведацца пра сваю будучыню.

Святую ваду дабаўлялі ў купель падчас першага рытуальнага купання дзіцяці; жанчына-парадзіха крапіла ёю грудзі перад першым кармленнем нованароджанага. Святой вадой пырскалі на маладых перад тым, як адправіць іх да шлюбу.

Каб выканаць рытуальныя дзеянні магічнага кшталту, найчасцей за ўсё выкарыстоўвалі менавіта хрышчэнскую ваду. Так, калі дачка не магла выйсці замуж, рабілі наступнае: бралі хрышчэнскую ваду, дзялілі на тры роўныя часткі, у гэты час чыталі малітву “Ойча наш”, потым нагаворвалі на ваду любоўную замову, напрыклад такую: “Я святою вадою ўмываюся, золатам уціраюся, сонейкам адзяюся, а месяцам падпяражуся, а зоркамі засцягнуся: я нікога не баюся. Як сонца і месяц на ўвесь свет свеціць, так каб я была на ўвесь свет міла і люба (імя каму)”.

Пасля гэтага адну частку вады давалі выпіць дзяўчыне, другой часткай трэба было памыць ёй твар, трэццю частку вылівалі за парог дома.

### Малое асвячэнне вады

На працягу года абрад асвячэння вады праводзілі яшчэ некалькі разоў, але яго ўжо называлі “малым”, вось толькі некаторыя з гэтых дзён:

- 20 студзеня, у дзень Сабора Іаана Хрысціцеля (у народзе гэты дзень празвалі “Ранняе Хрышчэнне”);
- у суботу перад Вялікаднём;
- у дзень Прапалавіння — у сераду на трэцім тыдні пасля Вялікадня;
- 14 жніўня — на Першы Спас, з прычыны чаго свята яшчэ называюць “Спасам на вадзе”, або “Мокрым Спасам”.

Ваду малых асвячэнняў таксама лічылі гаючай.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ